№№11–12
(2739–2740)

25 студзеня 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

ПРАТЭСТ

Сценка на сценку

У мінулы панядзелак прадпрымальнікі ў чарговы раз выйшлі на Кастрычніцкую плошчу.

На гэты раз "іпэшнікаў" было крыху меней — недзе каля дзвюх тысяч чалавек. Разам са шматлікімі журналістамі і сілавікамі ў цывільным.

Недзе каля паўгадзіны пасля збору на плошчы людзі тапталіся на месцы, не ведаючы, што ім рабіць далей. Адчувалася, што не хапае арганізатараў, якія б і распачалі мерапрыемства. Пазней аказалася, што лідэры прадпрымальнікаў напярэдадні акцыі дзейнічалі ў канспіратыўным стылі.

— Усе мы з рэгіёнаў прыехалі ў Мінск за тры дні да пачатку акцыі, — распавёў мне ўздзенскі прадпрымальнік Віктар КРЫВАЛЬ. — Было відавочна, што самых актыўных улады пастараюцца на розных падставах ізаляваць, а таму вырашылі так. Прыязджаем у Мінск загадзя, адключаем мабільныя тэлефоны і нікому не паведамляем сваё месцазнаходжанне.

Канспірацыя дала плён, на мітынгу з'явіліся і Віктар Крываль, і Ігар Леднік, і Віктар Калей, і іншыя... Адразу ж былі сфармуляваны і патрабаванні да ўлады: вызваленне ўсіх арыштаваных на акцыі 10 студзеня актывістаў; адмена пункта 1.1 Указа №760; сумесная распрацоўка доўгатэрміновага заканадаўства ў сферы малога бізнесу; сустрэча з Аляксандрам Лукашэнкам для абмеркавання праблем прадпрымальнікаў.

Акрамя таго, было прынята прынцыповае рашэнне аб тым, што прадпрымальнікі будуць ствараць грамадзянскі "Форум-2008" у абарону свабоды і правоў прадпрымальнікаў, пасля чаго народ дружнай калонай рушыў па сваім традыцыйным маршруце — па праспекце да Дома ўрада.

І, трэба сказаць, калона ўражвала. "Галава" была ўжо каля магазіна "Лакомка", а "хвост" яшчэ знаходзіўся на Кастрычніцкай плошчы. Ля ГУМа людзі паспрабавалі выйсці на праезную частку, аднак падагнаныя тры "аўтазакі" хутка вырашылі праблему і вярнулі "іпэшнікаў" на тратуар.

А на плошчы іх ужо чакалі. Спецназ у некалькі радоў са шчытамі і дубінкамі і асабіста міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў, які, напэўна, і кіраваў аперацыяй. Вакол тоўпіліся студэнты і іншы цікаўны народ, якім дзіўнае відовішча трэба было абавязкова зафіксаваць на мабільныя тэлефоны.

— Гатоўнасць праз 30 секунд, — пачулася ў рацыях спецназаўцаў у 14.19. З аднаго боку стаяла сцяна шэрых спецназаўцаў, з другога — людзі, якія выйшлі з пратэстам.

— Як падчас Кулікоўскай бітвы, — аўтарытэтна пракаментаваў нейкі дзед і ад граху далей шпарчэй закрочыў у падземны пераход.

Далейшыя падзеі разгортваліся імгненна. Людзей спачатку выцяснілі з плошчы, затым разбілі на групы, пасля чаго хто адправіўся дадому, а каго і закінулі ў "аўтазакі".

Наступная акцыя прадпрымальнікаў прызначана на 18 лютага.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ЦЕНЫ

Их не остановить

В Беларуси на 10% повышены розничные цены на сжиженный газ на автомобильных газозаправочных станциях. Соответствующее решение содержится в постановлении Министерства экономики.

Предельная минимальная цена повышена с 940 до 1030 белорусских рублей, предельная максимальная — с 990 до 1090 рублей. По решению того же ведомства, с 1 января 2008 года предприятия и индивидуальные предприниматели будут платить за природный газ по 145,2 доллара за тысячу кубометров. *"Цена установлена без налога на добавленную стоимость"*, — уточняет пресс-служба Министерства экономики.

Напомним, что в соответствии с белорусско-российскими соглашениями, в первом квартале 2008 года наша страна платит за российский природный газ 119 долларов за тысячу кубометров. Таким образом, "Белтрансгаз" за свои услуги берет с предприятий и организаций более 26 долларов с каждого кубометра.

Олег СНОВ.

Уладзімір СОДАЛЬ:

«Падобныя дзеянні я зазнаў у дзяцінстве ад нацысцкіх эсэсаўцаў»

Як вядома, 10 студзеня 2008 года пасля мітынгу прадпрымальнікаў на прыступках у пераходзе ля універсама "Цэнтральны" супрацоўнікамі міліцыі быў жорстка збіты 18-гадовы студэнт Артур КУЦЫХА. Пасля гэтага юнаку заламілі рукі за спіну і адвезлі ў Маскоўскі РАУС. Разам з ім затрымалі хлопца і дзяўчыну, якія спрабавалі яго абараніць. Іх таксама адвезлі ў РАУС. Па патрабаванні бацькоў з РАУСа была выкліканая медыцынская дапамога, пацярпелага даставілі ў Бальніцу хуткай дапамогі, дзе яму паставілі дыягназ "чэрапна-мазгавая траўма, узрушэнне галаўнога мозгу".

12 снежня 2007 года падчас правядзення акцыі ў абарону Незалежнасці Беларусі ў ваколіцах вул. Я.Купалы і ракі Свіслач быў па-зверску збіты 19-гадовы Зміцер ФЕДАРУК ды іншыя маладыя людзі. **Зміцера Федарука** байцы спецназу ўдарылі ў твар, спіхнулі на прыступкі, а калі той зваліўся, некалькі байцоў збівалі яго нагамі. Пасля вышэйзгаданых падзей З.Федарука даставілі ў 9-ю Клінічную бальніцу г.Мінска. Іншыя пацярпелыя былі адвезены ў 6-ю Клінічную бальніцу.

На працягу гадзіны юнак знаходзіўся ў непрытомнасці. У выніку дзеянняў супрацоўнікаў міліцыі на целе пацярпелага засталіся сляды шматлікіх пабояў, у яго былі дыягнаставаны чэрапна-мазгавая траўма сярэдняй цяжкасці, узрушэнне галаўнога мозгу, шматлікія гематомы і раны; на твары некаторы час заставаліся сляды ад удараў. На працягу тыдня Зміцер праходзіў лячэнне ў хірургічным аддзяленні спалучанай траўмы 9-й Клінічнай бальніцы г.Мінска.

За тыдзень да таго Зміцер Федарук знаходзіўся ў складзе дэлегацыі беларускіх палітыкаў, якія наведалі Злучаныя Штаты Амерыкі. Юнак меў асабістую размову з прэзідэнтам Дж.Бушам і К.Райс; як перакананы хрысціянін, ен засведчыў высокія маральныя і духоўныя ідэалы тых, хто адстойвае свабоду і дэмакратыю на Беларусі. Пасля вяртання на Радзіму праз некалькі дзен Зміцер быў жорстка збіты супрацоўнікамі міліцыі падчас акцыі ў прысутнасці шматлікіх сведкаў. У прыцягненні да адказнасці вінаватых, чаго патрабаваў у сваёй скарзе З.Федарук, было адмоўлена.

16 жніўня 2007 года патрыятычная моладзь праводзіла акцыю ў ваколіцах касцёла Св.Іосіфа на плошчы Свабоды за захаванне гістарычна важнага манастыра бернардзінцаў і супраць ператварэння яго ў гатэлевы комплекс. Юнакі і дзяўчаты запалілі свечкі і чыталі малітвы. Праз дзесяць хвілін пасля пачатку акцыі грубым фізічным чынам моладзь была выціснута з плошчы Свабоды да прыпынку грамадскага транспарту на вуліцы Няміга.

У той жа вечар падчас спробы затрымання маладзёжнага актывіста **Мікіты САСІМА** супрацоўнікамі міліцыі была збіта 19-гадовая **Таццяна ЦІШКЕВІЧ**. Калі дзяўчына паспрабавала ўступіцца за свайго сябра, яе павалілі на зямлю і нанеслі некалькі ўдараў нагамі. Таццяна Цішкевіч была шпіталізавана ў 9-ю Клінічную бальніцу ў аддзяленне нейрахірургіі з чэрапна-мазгавой траўмай. "Адчуваю сябе кепска. Болі ў нырках, спіне, сэрцы", — распавяла дзяўчына, калі яе наведалі ў бальніцы.

Акрамя Мікіты Сасіма і Таццяны Цішкевіч у гэты самы дзень траўмы атрымалі яшчэ шэсць удзельнікаў акцыі салідарнасці. У **Наталлі СУШКО** была зафіксаваная рана правай нагі ў вобласці калена. **Мікіта ШУЦЯНКОЎ** быў збіты ў твар. **Павел ЮХНЕВІЧ** і **Уладзімір НЕСЦЕР** атрымалі пабоі ў вобласці грудзей, спіны і ног.

26 красавіка 2007 года падчас правядзення "Чарнобыльскага шляху" на вуліцы Сурганава быў збіты з ног і кінуты на зямлю ў прысутнасці сведак 69-гадовы інвалід Вялікай Айчыннай вайны, вядомы беларускі пісьменнік Уладзімір Содаль. *"Падобныя дзеянні я зазнаў у дзяцінстве ад нацысцкіх эсэсаўцаў,* — сказаў пісьменнік пасля здзейсненага над ім здзеку. — *Няўжо мы зноў павінны пакутаваць?!"*

Гэтыя і многія іншыя факты выкладзены ў заяве бацькоў пацярпелых, вядомых грамадскіх дзеячаў на імя міністра унутраных спраў Ул.Навумава. Дадзены дакумент накіраваны таксама ў пракуратуру.

"...Дзеянні супрацоўнікаў праваахоўных органаў мы расцэньваем як мэтанакіраваны генацыд у дачыненні да лепшых прадстаўнікоў моладзі, якая адкрыта дэманструе сваю грамадзянскую пазіцыю ўдзелам у акцыях салідарнасці", — гаворыцца ў заяве.

Пётр КУЗНЯЦОЎ.

Каго пакаралі за ўдзел у акцыях прадпрымальнікаў?

21 студзеня міліцыяй было затрымана больш за дваццаць чалавек. Але на момант здачы гэтага нумара ў друк, на жаль, былі вядомы не ўсе прозвішчы.

Працэсы, часта за зачыненымі дзвярыма, праходзілі ў Маскоўскім і Цэнтральным судах Мінска.

1. **Бароўскі Вадзім**, суд Цэнтральнага раёна, штраф 700.000 рублёў.
2. **Пяцько Артур**, суд Маскоўскага раёна, арышт 15 сутак.
3. **Кукліш Віктар**, суд Маскоўскага раёна, арышт 15 сутак.
4. **Грэбенчук Аляксандр**, суд Цэнтральнага раёна, штраф 700.000 рублёў. (Праваабаронцы адзначаюць, што мужчына быў моцна збіты.)
5. **Дземідзенка Мікалай**, суд Маскоўскага раёна, штраф 700.000 рублёў.
6. **Люблянчык Аляксандр**, суд Маскоўскага раёна, штраф 700.000 рублёў.
7. **Сакалоўскі Валянцін**, суд Цэнтральнага раёна, штраф 700.000 рублёў.
8. **Бакур Юрый**, суд Цэнтральнага раёна, штраф 1.400.000 рублёў.
9. **Белагура Канстанцін**, суд Цэнтральнага раёна, штраф 700.000 рублёў.
10. **Саўчук Андрэй**, суд Маскоўскага раёна, штраф 525.000 рублёў.
11. **Круткіна Аляксандра**, суд Маскоўскага раёна, штраф 1.050.000 рублёў.
12. **Гладкая Аліна**, суд Цэнтральнага раёна, Самасейка Мікалай, штраф 1.050.000 рублёў.
13. **Саўчук Тамара**, суд Маскоўскага раёна, штраф 525.000 рублёў.
14. **Шаўцоў Сяргей**, суд Маскоўскага раёна, 15 сутак арышту.
15. **Бугаеў Віктар**, суд Маскоўскага раёна, штраф 700.000 рублёў.
16. **Субач Міхаіл**, суд Цэнтральнага раёна. Асуджаны па двух пратаколах за удзел у акцыях 10 і 21 студзеня -- 1.400.000 рублёў
17. **Андрэй Шарэнда**, суд Цэнтральнага раёна, штраф 1.750.000 рублёў.
18. **Бондар Аляксей**, суд Маскоўскага раёна, арышт 5 сутак.
19. **Субач Ліля**, суд Маскоўскага раёна, штраф 1.050.000 рублёў.
20. **Прэсняк Андрэй**, суд Маскоўскага раёна, арышт 10 сутак.

Нагадаем, што за ўдзел у акцыі 10 студзеня было затрымана больш за 50 чалавек. Міліцыя хапала людзей не толькі падчас самой акцыі, але і праз шмат дзён пасля яе.

ПА ЧУТКАХ І...

Пётр Міклашэвіч просіцца ў адстаўку?

Напрыканцы мінулага года ў пэўных колах пачалі казаць пра тое, што генеральны пракурор Пётр Міклашэвіч быццам бы напісаў на імя А.Лукашэнкі заяву аб адстаўцы.

Маўляў, асобныя высокапастаўленыя чыноўнікі, якія лічацца набліжанымі да кіраўніка дзяржавы, перашкаджаюць працаваць. Але адстаўку генпракурора быццам бы не задаволілі...

"Народная воля" вырашыла праверыць гэтыя чуткі і наўпрост пацікавілася ў Пятра Міклашэвіча, ці сапраўды ён прасіўся ў адстаўку.

Перапытаўшы, Пётр Пятровіч са смехам адказаў: "Не, ну што вы! Гэта домыслы нейкія!.."

Марына КОКТЫШ.

ЕЎРАБАЧАННЕ-2008

У Сербію едзе Руслан Аляхно

26-гадовы ўраджэнец Бабруйска Руслан Аляхно прадставіць Беларусь на Міжнародным конкурсе песні "Еўрабачанне-2008" у Бялградзе (Сербія).

Імя пераможцы вызначыла прафесійнае журы паводле вынікаў фіналу Нацыянальнага тэлевізійнага музычнага праекта "ЕўраФэст".

У фінале конкурсу выступілі чатыры ўдзельнікі: Руслан Аляхно, Гюнеш, гурты "По глазам" і "Litesound".

У склад журы ўвайшлі першы намеснік міністра культуры Уладзімір Рылатка, народныя артысты Беларусі Васіль Раінчык і Анатоль Ярмоленка, народная артыстка Беларусі Ядвіга Паплаўская, дырэктар дырэкцыі музычных і забаўляльных праграм Белтэлерадыёкампаніі Дзяніс Шпітальнікаў, намеснік дырэктара галоўнай дырэкцыі Першага канала Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Капёнкін, заслужаная артыстка Беларусі Ірына Дарафеева, кампазітар Леанід Шырын. Старшыня журы — народны артыст Беларусі Міхаіл Фінберг.

У адпаведнасці з новымі правіламі конкурс "Еўрабачанне-2008" будзе складацца з двух паўфіналаў (пройдуць 20 і 22 мая) і фіналу, які запланаваны на 24 мая. Прадстаўнік Беларусі возьме ўдзел у адным з паўфіналаў.

Згодна з правіламі, што дзейнічалі раней, права на аўтаматычны выхад у фінал, апрача канкурсантаў з краін - заснавальніц конкурсу, мелі выканаўцы, якія ўвайшлі ў дзесятку найлепшых. На гэта разлічвала і Беларусь, прадстаўнік якой Дзмітрый Калдун у 2007 годзе заняў на "Еўрабачанні" шостае месца. Аднак новы рэгламент дае права на аўтаматычны выхад у фінал толькі канкурсантам з Вялікабрытаніі, Германіі, Іспаніі і Францыі, краін — заснавальніц "Еўрабачання", а таксама краіне — пераможцы папярэдняга конкурсу.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

БЕСПРЕЦЕДЕНТНЫЙ ПРОЦЕСС

Общественное объединение против Совмина

В Высшем Хозяйственном суде должно состояться очередное слушание по иску РПОО "Белорусский Хельсинкский комитет" к Совету министров Республики Беларусь.

Подчеркнем, что сам факт подачи иска к правительству является беспрецедентным шагом в истории белорусского права. А решение, которое в итоге примет суд, станет одним из факторов, влияющих на инвестиционную привлекательность нашей страны.

Напомним суть дела. 28 августа 2007 года РПОО "Белорусский Хельсинкский комитет" направил в Высший Хозяйственный суд иск к Совету министров Беларуси о возмещении убытков на сумму 255 тысяч рублей.

Правовым основанием для предъявления иска к Совмину, по мнению юристов БХК, явилось бездействие ответчика по приведению нормативно-правовой базы Республики Беларусь в соответствие с обязательствами в рамках межправительственного соглашения между Комиссией европейских сообществ и правительством Беларуси об оказании технической помощи по программе TACIS в Беларуси ("Развитие гражданского общества").

Данный международный договор предусматривал, что налоги, таможенные пошлины не будут финансироваться из субсидий ЕС, физические и юридические лиц будут освобождены от уплаты взимаемых в Республике Беларусь налогов и сборов.

На момент подписания Меморандума о финансировании (1999 г.) в национальном законодательстве действовали нормы, устанавливающие налоговые льготы. Следовательно, не было необходимости вносить изменения и дополнения в национальное законодательство для приведения его в соответствие с нормами международного договора. Однако с 1 января 2002 года в Закон "О налогах на доходы и прибыль" были внесены изменения, указанную льготу исключили.

Совет министров после отмены льгот по налогу на доходы обязан был (в соответствии со ст.16 Закона "О международных договорах Республики Беларусь") внести предложения по приведению национального законодательства в соответствие с заключенным международным договором.

Однако законодательные нормы, регулирующие данный вопрос, были утверждены Указом президента лишь 22.10.2003 г. (под №460 "О международной технической помощи, предоставляемой Республике Беларусь").

Таким образом, в период с 01.01.2002 г. по 22.10.2003 г. нормативное регулирование вопросов налогообложения иностранной технической помощи национальным законодательством не осуществлялось. Нормы международного договора (в нарушение требований Венской конвенции), по мнению органов власти, управления и судов Беларуси, не могли быть применены как нормы прямого действия.

Иностранную безвозмездную помощь, полученную БХК в период с января 2002 г. и до принятия Указа №460, инспекция отнесла к доходам и начислила налоги.

В исковом заявлении сделан вывод, что бездействием Совмина были нарушены права БХК на налоговые льготы, предусмотренные международным договором. Налоговая инспекция начислила налоги на использованные в этот период денежные средства технической помощи и применила к БХК экономические санкции, руководствуясь национальным законодательством. В отсутствие у БХК возможности уплаты задолженности инспекция изъяла и обратила в доход государства имущество организации на сумму 255 тысяч рублей. Эта сумма и является предметом хозяйственного спора в суде.

5 октября 2007 г. решением ВХС дело было закрыто. Прекращая дело на основании ст.149 ХПК, суд указал, что Совмин в соответствии с Законом Республики Беларусь "О Совете министров Республики Беларусь" не является юридическим лицом. Между тем такое основание для прекращения дела в данной статье ХПК отсутствует.

Рассматривается кассационная жалоба на это решение.

Игорь МОРОЗОВ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 СТУДЗЕНЯ 2008 г.

СУД!

143 выданні ў 56 краінах надрукавалі карыкатуры на прарока Мухамеда. І ні аднаго рэдактара ці журналіста не ўпяклі ў турму. Намеснік рэдактара беларускай газеты "Згода" Аляксандр Здзвіжкоў, якую ўлады ўжо закрылі за перадрукоўку вышэйзгаданых карыкатур, атрымаў тры гады пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Ісмаіл ВАРАНОВІЧ:

«Я быў змушаны напісаць ліст»

Кіраўнік Духоўнага упраўлення мусульман Ісмаіл Варановіч распавёў "Еўрарадыё", чаму на судзе ён фактычна абараняў рэдактара "Згоды"

— Вы ведаеце, што Мінскі гарадскі суд асудзіў журналіста Здзвіжкова на 3 гады калоніі за спробу перапублікацыі карыкатур на прарока Мухамеда?..

— Я быў сведкам на гэтым працэсе і даваў паказанні. Я імкнуўся змякчыць яго долю. Здзвіжкоў дзякаваў мне — наколькі мог, вядома.

— Вам не здаецца, што гэта занадта суровае пакаранне?

— Вядома, суровае! Я прасіў, каб рашэнне суда было мякчэйшым. Тым больш што ён не заклікаў ні да якіх злачынстваў. Гэта была своеасаблівая інфармацыя пра тое, што было апублікавана ў дацкіх газетах. Вось так я ставіў пытанне. І я лічу, што ў нашым грамадстве ніякіх эксцэсаў, ніякага рэзананс у і не магло быць.

— Скажыце, Здзвіжкоў прасіў у вас прабачэння ў судзе?

— Так, у мяне асабіста прасіў прабачэння. І прасіў прабачэння ва ўсіх нашых вернікаў-мусульман за публікацыю ў газеце.

— Калі б ад вас залежала, то вы б даравалі яму?

— Так, вядома, вядома! Можа быць, я крышку ўскладніў становішча з органамі ўлады, якія вядуць гэтую справу.

— Чаму вы так думаеце?

— Ну, таму што, можа быць, дзяржаўныя органы меркавалі, што мае словы будуць іншымі, не ў такім кірунку. Я насуперак, можа быць, пайшоў...

— Вы ведаеце, наколькі мусульмане Беларусі былі не задаволеныя гэтай публікацыяй?

— Дык яны ж не паспелі нават і зведаць, што такая публікацыя была. Калі мяне пазнаёмілі з ёй органы ўлады, я быў змушаны напісаць ліст, адрэагаваць. Гэта мне паведамілі як кіраўніку Духоўнага упраўлення мусульман Рэспублікі Беларусь.

— А куды вы гэты ліст пісалі?

— У той жа самы орган, які мяне азнаёміў з публікацыяй. Гэта Камітэт па справах рэлігіі і нацыянальнасцяў.

— Вы пісалі, што абураны?

— Гэта было паднесена так, што я быў змушаны гэта зрабіць.

— Вам нават не паказвалі газету?

— Паказалі. Паказалі ксеракопіі, далі мне.

— І там былі карыкатуры? Бо гэтую газету ніхто не бачыў, акрамя вас і яшчэ некалькіх чалавек...

— Ну так. Але я, між іншым, папярэдзіў нашы абшчыны: калі газета выпадкова патрапіць вам, каб ніякай рэакцыі не было. Гэта толькі інфармацыя пра тое, што было надрукавана ў іншых часопісах і газетах Еўропы. Вось так гэта было паднесена. Таму ніякіх абурэнняў з боку нашых абшчын не было.

— Рэдактар газеты "Згода" звярнуўся да мусульман з просьбай дапамагчы выратаваць Здзвіжкова ад турмы...

— Яшчэ трэба ўзважыць становішча. Узважыць усю навакольную абстаноўку. Як гэта адаб'ецца на нас. Мы ж меншасць, нас жа, мусульман Беларусі, вельмі мала. Таму мы павінны быць вельмі асцярожныя.

— А нагадаеце, як пакаралі дацкіх журналістаў?

— Слова гонару, я не ведаю. Патрабавалі для аўтара публікацыі смяротнага пакарання. Як гэта ўсё завяршылася, я сапраўды не ведаю. Гэта даўно было, не памятаю. А Здзвіжкоў, калі я яго ўбачыў за кратамі, то мне яго шкада стала. Такі худзенькі, невялікі... Вось, слова гонару, чалавечы жаль у мяне з'явіўся... Калі б у маіх сілах, я яго вызваліў бы, але гэта не ў маіх сілах. Вы мяне разумееце?! Наколькі я мог, я, вядома, імкнуўся аблегчыць яго долю.



Аляксандр Здзвіжкоў. Фота photo.bymedia.net

РЭЗАНАНС

Міжнародная праваабарончая арганізацыя "Рэпарцёры без межаў" выказала абурэнне прыгаворам былому рэдактару па выпуску газеты "Згода" Аляксандру Здзвіжкову.

"Прыгавор — надзвычай суровы, — гаворыцца ў заяве "Рэпарцёраў без межаў", якую распаўсюдзіла прэс-служба арганізацыі. — Здзвіжкоў не павінен быў пераследавацца судом. Хутчэй за ўсё крымінальнай справай спрабуюць апраўдаць жаданне пакараць апазіцыйнага журналіста. Пра гэта могуць гаварыць і акалічнасці яго арышту".

"Рэпарцёры без межаў" звяртаюць увагу, што "Згода" была друкаваным органам Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада), якую ўзначальваў экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін.

ВОДГУКІ

Прадстаўнік Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЭ) Міклаш Харашці выказаў пратэст у сувязі з прысудам Аляксандру Здзвіжкову. "Я заклікаю ўлады Беларусі перагледзець судовы прыгавор і вызваліць Здзвіжкова", — сказаў Харашці, словы якога цытуе агенцтва РІА Новости.

Рэдактар аддзела культуры дацкай газеты "Jullands-Posten" Флемінг Роўз, адказны за першую публікацыю скандальных карыкатур, лічыць, што *"судзіць за гэта проста ганьба і глупства"* і што *"працэс над "Згодай" не варты еўрапейскай краіны XXI стагоддзя"*. Сам Флемінг Роўз пасля скандалу быў проста адпраўлены ў адпачынак і дагэтуль працуе ў тым жа выданні. *"Я заклікаю беларускія ўлады вызваліць Здзвіжкова — ён зрабіў сваю працу, гэта не злачынства"*, — зазначыў Роўз і заклікаў усіх, каму дарагая свабода слова, выказаць свой пратэст супраць гэтага прысуду.

БЕСПРЕДЕЛ

Судили за то, чего не случилось

В эти дни в центре внимания белорусских и международных СМИ оказался житель города Борисова Минской области Александр Сдвижков. Бывший заместитель главного редактора независимого еженедельника "Згода" 11 января предстал в наручниках перед Минским городским судом.

Уголовное дело по статье, именуемой "Разжигание расовой, национальной или религиозной вражды или розни", завели на Сдвижкова два года назад. Многие помнят международный конфликт двухлетней давности. Тогда одна датская газета напечатала серию карикатур на пророка Мухаммеда. Они вызвали ярость и негодование немалого количества мусульман. Многие датские товары подверглись жесткому бойкоту в исламских странах. Посольства же Дании в некоторых из них пережили угрозу штурма со стороны религиозных фанатиков.

В Беларуси господин Сдвижков, будучи на тот момент выпускающим редактором оппозиционной газеты "Згода", в начале 2006 года перепечатал на ее страницах несколько карикатурных изображений. По моему мнению, довольно безобидных и лишенных каких-либо непристойностей. Тем не менее от мусульманских общин республики последовало обиженное обращение в правоохранительные органы. Сначала им занимался КГБ. Следователь-чекист допросил 47-летнего редактора. Однако допустил непростительную для своего ведомства оплошность. Он не взял с допрашиваемого не то что подписку о невыезде, а даже письменное обязательство о явке на последующие допросы. Вскоре после этого "Згода" была закрыта властями. Почуяв, что дело пахнет керосином, Александр Михайлович Сдвижков счел за лучшее уехать в Москву. Затем переехал в Киев. Одно время жил в православном монастыре. В Беларуси же против редактора и журналиста Сдвижкова возбудили уголовное дело по статье 130 части 1 УК РБ.

Уголовное преследование за чужие рисунки было для него неожиданным. Он-то скорее ожидал, что его будет преследовать президентура за публикацию перед президентскими выборами огромного и разоблачительного интервью с конкурентом Александра Лукашенко — Александром Козулиным.

Как бы то ни было, Комитет госбезопасности перепасовал дело в Генеральную прокуратуру. А за бесшабашным скандалистом была развернута самая настоящая охота. Соседям было велено незамедлительно позвонить сыщикам в случае появления беглеца у себя в доме. Сдвижков же прошлой осенью, спокойно и не таясь, приехал в город на Березине в очередную годовщину смерти посетить могилу отца. 18 ноября 2007 года журналиста арестовали в Беларуси.

На суде выяснилось, что Генпрокуратура в последнюю минуту утяжелила обвинение. Теперь журналисту вменили статью 130 часть 2 УК РБ. Такая переквалификация чудовищна. Судите сами. Вот что в части 1 статьи "Разжигание расовой, национальной или религиозной вражды или розни" говорится:

"Умышленные действия, направленные на возбуждение расовой, национальной или религиозной вражды или розни, на унижение национальной чести и достоинства, — наказываются штрафом или арестом на срок до шести месяцев, или ограничением свободы на срок до пяти лет, или лишением свободы на тот же срок".

А вот что говорится в части 2:

"Те же действия, соединенные с насилием либо совершенные должностным лицом с использованием своих служебных полномочий, — наказываются лишением свободы на срок от трех до десяти лет".

...Начало судебного процесса стало бурным. Обвиняемый сделал громкий отвод судье Руслану Анискевичу. Мол, тот идет на поводу Прокуратуры РБ. Ведь Анискевич объявил решение о продлении больше чем на месяц срока содержания Сдвижкова под стражей правильным. И при этом даже не потрудился дать мотивировочную часть такого решения.

Узник заявил, что его преследуют не по политическим, а по религиозным мотивам.

Выслушав отвод себе, Руслан Анискевич объявил перерыв. Он затянулся так надолго, что присутствовавшие журналисты и правозащитники стали нервничать. Но, приоткрыв дверь зала судебных заседаний, они с удивлением обнаружили, что процесс продолжается без них. Вышедший к ним начальник караула в звании прапорщика поведал, что разбирательство объявлено закрытым. Это возмутило публику. Ведь судья сам обязан сделать подобное заявление в зале перед пришедшими на суд. А затем уже предложить им удалиться. Возмущенная пишущая и правозащитная братия пошла жаловаться к руководству Мингорсуда. От него Анискевич, как я понимаю, получил по шапке за несоблюдение элементарных правил ведения уголовного процесса. Поэтому всех вновь пригласили в зал заседаний, где принесли извинения. Выяснилось, что с ходатайством о разбирательстве дела в закрытом порядке выступил представитель гособвинения капитан юстиции Алексей Веренчиков. Для обоснования своего удовлетворенного судом ходатайства он сослался на статью 23 Уголовно-процессуального кодекса. Она допускает возможность закрытого разбирательства, когда этого требуют интересы обеспечения безопасности потерпевшего, свидетеля или иных участников уголовного процесса, а также близких им лиц. Обвиняемый хотел открытого суда. Может, свидетели обвинения боялись огласки?..

Председатель религиозного объединения "Духовное управление мусульман в Республике Беларусь" Муфтий Исмаил Воронович был на процессе свидетелем. Однако вот что он заявил в беседе с пресс-службой общественного объединения "Белорусская ассоциация журналистов":

"Я вообще не требовал наказания. Я хотел, чтобы больше таких язвительных карикатур не печатали. Чтобы вызвали главного редактора или ответственного за печать этих рисунков и сделали ему какой-то выговор. Мое требование было ограничено только этим. Я думал, что это дело уже закрыто, и газета работает..."

Тем не менее суд вынес беспрецедентный приговор: три года колонии. Учредитель и главный редактор "Згоды" Алексей Король считает, что Александра Сдвижкова судили за то, чего не случилось. После публикации злосчастных картинок прошло уже два года. Но каких-либо проявлений религиозной вражды или розни в республике не случилось. Обвиняемый будет обжаловать приговор.

Александр АБРАМОВИЧ, председатель Борисовского отделения Международной ассоциации защиты прав человека.

ВАС ЦІКАВІЦЬ

Куды сышоў Кулічкоў?

Сродкі масавай інфармацыі паведамілі пра прызначэнне былога кіраўніка Мінскай вобласці на пасаду кіраўніка справамі прэзідэнта. А куды ж падзеўся наш зямляк, былы кіраўнік Магілёўшчыны Аляксандр Кулічкоў? Няўжо без працы застанецца?

Васіль Прохараў, Магілёў.

Аляксандр Кулічкоў у апошнія гады змяніў шмат пасад — ад кіраўніка вобласці да міністра і кіраўніка справамі прэзідэнта і, падобна на тое, што без працы ён і зараз не застанецца. Па крайняй меры, Аляксандр Лукашэнка, прадстаўляючы свайму Кіраўніцтву справамі новага начальніка, публічна упэўніў, што новае месца для Кулічкова таксама знойдзена. Ён падзякаваў Кулічкову за працу і сказаў, што яму *"будзе прапанавана высокая пасада ў Саюзнай дзяржаве"*.

Верагодна, маецца на ўвазе месца кіраўніка прадстаўніцтва Саюзнай дзяржавы ў Мінску, якое пасля трагічнай гібелі Васіля Шаладонава амаль год застаецца вакантным.

Алена НОВІКАВА.

ЗДАРЭННЕ

Сапраўднае пекла ў манастыры

У Навагрудскім раёне 80-гадовы ігумен Лазар (Іван Цімафеевіч Бачаркін) выратаваў ад смерці ў агні шэсць манахаў.

Пра гэта паведаміла прэс-служба Гродзенскага абласнога упраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Агонь палыхнуў ноччу ў адным з жылых памяшканняў Свята-Елісееўскага Лаўрышэўскага мужчынскага манастыра, што месціцца ў вёсцы Гнесічы Навагрудскага раёна. Ігумен Лазар першым заўважыў полымя і фактычна выратаваў манахаў, якія ўжо спалі. Аднаму з іх нават давялося выскокваць з акна другога паверха, бо полымя адрэзала выхад па лесвіцы.

Прычына ўзгарання — няспраўнасць дымахода печы.

ІНІЦЫЯТЫВА

Графік перакураў

Адкрытае акцыянернае таварыства "Малочны свет" першым у Гродзенскай вобласці ўвяло графік перакураў для сваіх супрацоўнікаў. Пра гэта паведаміў генеральны дырэктар прадпрыемства Іосіф Шышко.

Па яго словах, цяпер кожны, хто паліць, можа пакінуць сваё працоўнае месца толькі ў строга вызначаны час. Сваё рашэнне дырэктар патлумачыў тым, што спецыфіка малочнай вытворчасці патрабуе чыстаты, парадку і дакладнага тэхналагічнага рытму.

ТОЧКА ЗРЕНИЯ

В карете прошлого далеко не уедешь,

или О том, нужна ли Беларуси атомная станция

Итак, Совет Безопасности Беларуси принял окончательное (?!) решение о строительстве у нас АЭС. Не знаю, чем руководствовались члены совета. На мой взгляд, не интересами Беларуси. Потому что рано или поздно это решение будет признано ошибочным и найдется крайний, на кого свалят ответственность. А может, и не найдется. Все спишется на коллективную безответственность, как это у нас не раз происходило в прошлом. Мы стараемся забыть и Афганистан, и Чернобыль, и многое другое, на чем умные люди должны учиться. Мы, как это было во многих других безответственных решениях, ищем безопасность в опасности, преимущества — в недостатках, выигрыш — в проигрыше.

Стыдливо скрываясь за фразами о безальтернативности ядерной энергетики, выбрали худший вариант обеспечения национальной безопасности. Чьито сомнительные интересы возобладали над здравым смыслом. Как физик-ядерщик, 35 лет отдавший ядерной энергетике, я вижу проблему еще и с точки зрения того огромного морального (и психологического) ущерба от чернобыльской аварии, которая в последнее время замалчивается. А ведь даже эти два фактора по-прежнему несут в себе опасность для будущего нации, ибо, как констатируют независимые медики, уже произошли генные изменения в организмах наших детей, которые будут продолжаться и в следующих поколениях. Но как специалист я буду говорить о других аспектах.

Программа строительства АЭС в Беларуси заберет миллиарды долларов скорее всего не будет выполнена, а ядерное лобби впоследствии будет шантажировать правительство возможностью аварий и требовать новых инвестиций. И все это за счет многострадального белорусского народа, до сих пор переживающего Чернобыль... Мифическая выгода от строительства АЭС скоро рассеется при уточнении расчетов. Говорить о повышении военной безопасности тоже по меньшей мере смешно. Полностью обезопасить АЭС от терроризма или военного нападения невозможно. Еще в 1980-е годы в США вышло несколько изданий монографии "АЭС — оружие для врага. Недооцененная военная угроза" (думаю, Совбезу это известно), ведь в годы холодной войны наши ракеты были нацелены на американские АЭС, а американские — на наши как на самые эффективные цели с точки зрения нанесения военного удара. Что касается энергетической независимости, то и здесь любому понятно, что ядерная зависимость гораздо страшнее углеводородной.

Не случайно динамика развития ядерной энергетики в последние 20 лет гораздо ниже, чем использование других источников энергии. И эта тенденция будет продолжаться. Уже сейчас промышленно развитые страны у себя дома практически прекратили строительство новых АЭС. Продолжают их строить только те страны, которые создают ядерные арсеналы (Китай, Южная Корея, Индия и Пакистан). Но... это их проблемы. Мы же напрасно зацепились за старую, изживающую себя ядерную технологию середины прошлого века. Она не сулит нам никаких перспектив развития. Начав строительство АЭС, мы потеряем время, а время — это возможность выбора. Поспешно принятое решение означает, что выбора у нас становится все меньше. И мы сами себя загоним в тупик. Беларусь все-таки уникальная страна по многим параметрам, например, по количеству пресной воды, которая уже становится стратегическим ресурсом. И это надо было бы использовать.

В нынешних критических условиях недостатка инвестиций и энергоресурсов нашим экономистам необходимо было определить экономообразующую приоритетную отрасль, развитие которой потянет за собой все остальные отрасли экономики. Такая теория экономического тарана оправдала себя в Японии, Южной Корее, Малайзии, превратив слабые экономики этих стран в преуспевающие. Например, в условиях нехватки природных ресурсов и энергоносителей экономика Японии базируется в основном на двух наукоемких отраслях: микроэлектронике и малолитражном автомобилестроении.

Сейчас во всем мире наблюдается всплеск интереса к использованию возобновляемых энергоресурсов в силу их экологической чистоты, возможности замены ими истощаемого органического топлива и возможности их применения в автономных источниках энергии. И эта тенденция будет усиливаться с каждым годом. Ветровая, солнечная и особенно геотермальная энергетика завоевывает все больший удельный вес в энергобалансе многих стран.

Беларусь в этих условиях могла бы форсировать развитие малой энергетики и разработку перспективных технологий, не зависящих от наличия природных энергоресурсов. В основу этих технологий для начала могут быть положены, например, известные работы Олега Грицкевича, Юрия Потапова, Валерия Дудышева, Владимира Леонова и многих других разработчиков новой энергетики. Ведь сотни бестопливных энергоустановок этого направления уже успешно работают, доказывая реальность новой энергетики. Например, производство электрической энергии квантовым двигателем-генератором Владимира Леонова мощностью 100 кВт позволяет снизить тарифы на электроэнергию в 2,8 раза, а квантовые теплогенераторы способны снизить тарифы на тепло в 8 раз. При этом не требуется химического или ядерного топлива.

На гребне волны по освоению таких технологий мы могли бы развить свою национальную науку и укрепить научно-технический потенциал своей страны. На этом пути нас могли бы ожидать новые достижения, открытия и патенты, которые, между прочим, можно продавать другим державам.

Конечно, без политической поддержки реализация новых технологий будет встречать бюрократическое сопротивление как со стороны властных структур, так и со стороны старой академической элиты, которая сама уже не в состоянии ничего предложить, но и не желает расстаться со своей руководящей ролью. Финансовые структуры и бизнес в условиях неэффективной экономики в целом не заинтересованы в инновационной деятельности. Необходима серьезная законодательная база, стимулирующая инвестиции в новые технологии, без которых невозможны структурные перестройки нашей устаревшей экономической модели. В этом направлении, конечно, много работы. Но это будет плодотворная работа, направленная на развитие собственной экономики. А взявшись за ядерную авантюру, мы вынуждены будем, как говорится, "работать на дядю", поддерживать высокий уровень атомной промышленности государства — поставщика АЭС, а у себя оставить в наследство нашим детям и внукам кучу проблем. Неужели мы так глупы и бездарны?!

Думаю, что Совбез должен пересмотреть свое решение о строительстве АЭС в Беларуси.

Егор ФЕДЮШИН, физик-ядерщик.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 СТУДЗЕНЯ 2008 г.

ЗАКОН И СПРАВЕДЛИВОСТЬ

Почему у бывших коллег разные пенсии?

В 1969 году в Логойскую районную больницу приехали работать два доктора. Прошло время, врачи стали пенсионерами. Но один получает пенсию в размере 390 тысяч рублей, другой — около двух миллионов. Почему?

«Рубаху на груди не рвал»

Все дело в том, что Виктор Порфенович — бывший главврач Логойской центральной районной больницы — в 2000 году был избран депутатом Палаты представителей Национального собрания. Не будем говорить о том, как, по чьей инициативе и при чьей поддержке проходило его выдвижение кандидатом в депутаты. Не будем говорить и про то, как велись агитация и голосование. Факт заключается в том, что четыре года Порфенович прозаседал в Овальном зале, но после депутатской работы в родную больницу уже не вернулся. Какое-то время Виктор Петрович проработал в горнолыжном центре "Силичи", а затем ушел на заслуженный отдых.

В 2006 году Александр Лукашенко подписал указ *"О ежемесячном денежном содержании отдельных категорий граждан"*, и пенсии бывших депутатов — тех, которые заседали в Палате представителей и Совете Республике, стали составлять 65 процентов от зарплаты нынешних "народных избранников". Ни много ни мало, но эта сумма, например, в декабре 2007 года составила около двух миллионов рублей. К слову, несложно подсчитать, какую зарплату получают нынешние депутаты — те, что принимали закон об отмене льгот и одобрили положение о приеме на некоторые специальности в белорусские вузы абитуриентов по рекомендациям райисполкомов и БРСМ. Но это уже иная тема.

Мы же вернемся к логойским пенсионерам. Вернее, к экс-депутату Палаты представителей Виктору Порфеновичу. О том, какую пенсию он сейчас получает, мы уже знаем — почти два миллиона рублей. Скажете: за какие такие заслуги? Нам трудно ответить на этот вопрос. Но, судя по всему, особые способности Виктора Петровича в депутатский период его биографии не проявлялись. В парламенте депутат Виктор Порфенович вел себя тихо и так же тихо голосовал за все документы, которые без жарких споров и ожесточенных дебатов принимались в ту пору, как, собственно, и сейчас, в Овальном зале. Виктор Порфенович в отличие от своего почти тезки и коллеги по депутатскому корпусу Владимира Парфеновича не был замечен в рядах депутатской группы "Республика", члены которой пытались провести в парламенте слушания о делах исчезнувших белорусских политиков и голодали в знак протеста, когда их попытки внести изменения в Избирательный кодекс были проигнорированы их же коллегами. *"Виктора Порфеновича я, конечно, помню,* — говорит депутат Палаты представителей 2-го созыва Валерий Фролов. — *Нормальный был мужик. Очень спокойный, аккуратный, но рубаху на груди не рвал".*

Когда пришло время выхода на заслуженный отдых, хирург Виктор Порфенович пенсию получил, можно сказать, не за работу в больнице, а за четыре года депутатской деятельности. Вот так: как врач, пусть даже главный, он и мечтать не мог о такой пенсии. А оказался перед выходом на заслуженный отдых в высшем эшелоне власти — и пожалуйста, почти два миллиона каждый месяц в кармане!

В Логойске на улице Строителей живет бывший заместитель главврача районной больницы Милица Громова. 46 лет Милица Николаевна спасала больных. Приехала в Логойск в далеком 1947 году, сразу после окончания Одесского мединститута. *"И в операционной стояла, и гинекологом работала,* — вспоминает она сегодня. — *Во всей больнице было только три доктора, я — четвертая. В Беларусь ехала не только с дипломом врача, за плечами была практика в военном госпитале, я же еще в 1941 году, как только началась война, окончила курсы медсестер".*

Милица Николаевна Громова: а я даже не знала, что у Порфеновича такая пенсия.

Сегодня пенсия у 83-летней Милицы Николаевны Громовой, врача с 46-летним стажем, 426 тысяч рублей, в четыре с половиной раза меньше пенсии экс-депутата и такого же доктора, как она, Виктора Порфеновича. Но Милица Николаевна не жалуется. Да она, пока мы не сказали, и не знала, как отблагодарила власть за работу в так называемой Палате ее младшего коллегу. С чем не согласна, так это с отменой льгот для студентов...

Кстати, в 1969 году вместе с молодым врачом Порфеновичем в Логойскую районную больницу по распределению приехал работать выпускник Минского мединститута Владимир Плащинский. Всю жизнь он проработал рентгенологом. Сейчас Владимир Степанович пенсионер. Но по-прежнему работает в больнице: на пенсию в 390 тысяч прожить сложно. Я попробовала порассуждать с ним о том, справедливо ли поступает государство, создавая такую разницу в размере пенсий врачей и депутатов, но ничего не получилось. Может, потому, что Плащинский действительно всю жизнь проработал рука об руку с Порфеновичем и считает не совсем этичным вести разговор, связанный с ним, но от каких-либо комментариев Владимир Степанович отказался.

Сегодня в Логойской районной больнице работают четыре врача пенсионного возраста — терапевт, невропатолог и два рентгенолога. Но медсестры меня сразу предупредили: разговаривать с журналистом они не будут. И, как бы извиняясь, добавили: сегодня они с вами поговорят, а завтра их уволят, они же почти на птичьих правах.

Не удалось мне встретиться и с Виктором Петровичем Порфеновичем. Дома его не застала, по телефону он сказал, что будет позже. А когда я заявилась через определенное время, домашние сказали, что срочно уехал за пределы района.

Нет, я и не думала предъявлять какие-либо претензии к Виктору Петровичу. Получил высокую пенсию (или пособие — называть можно и так, и так) — и слава Богу! При нынешних ценах, расходах на жилье, транспорт, отдых и т.д. — это как раз то, что обеспечивает человеку достойную жизнь на склоне лет.

В 1998 году остатки последнего Верховного Совета СССР во главе с Сажи Умалатовой вернулись к идее. Ими в качестве "ордена Сталина" был выбран вариант, где в центре круга, накладываемого на звезду, помещено рельефное изображение Сталина. Вождь народов изображен в мундире генералиссимуса с Золотой и маршальской звездами. По краю круга вокруг портрета на красном фоне размещены слова: "СТАЛИН. ДЕРЖАВА. ВЕРА. ПОБЕДА." Естественно, наградой в полном смысле этого слова "значок" не является.

Олег СНОВ.

ЛЁСЫ ЛЮДСКІЯ

Іван і Ганна БЛАДЫКІ:

«Толькі б не страціць адзін аднаго...»

...Толькі два разы на дзень грамадскі транспарт дастаўляе сюды пасажыраў. Каб трапіць у вёску Крапужына Лагойскага раёна, ад аўтобуснага прыпынку трэба яшчэ прайсці пешшу дзесьці кіламетры тры. Калісьці тут былі хутары, якія ў часы калектывізацыі аб'ядналі ў адну вёску. Адзін з хутароў насіў назву Бладыкаўшчына. Менавіта тут нарадзіўся герой нашага аповеду Іван Ігнацьевіч Бладыка, просты і сумленны чалавек, руплівы гаспадар, які ў самыя складаныя часы не губляў пачуцця ўласнай годнасці і гумару. Відаць, толькі сапраўдны аптыміст можа перад тым, як легчы спаць, з усмешкай зазначаць:"Ну ўсё, я памёр".

Першы хлопец на вёсцы

Івану давялося скончыць усяго чатыры класы, але затое па ўсіх прадметах ён меў адзнакі "выдатна". А яшчэ старанны хлопчык працаваў пастушком, за што і быў узнагароджаны кіраўніцтвам калгаса новымі ботамі, якія, на жаль, бацька прымусіў падараваць старэйшай сястры — а як жа, ёй трэба было выходзіць замуж. Канечне, Іван пакрыўдзіўся, але што рабіць?

Падчас вайны хлопец трапіў у нямецкі палон і быў вывезены ў Германію, дзе працаваў у прыватнай гаспадарцы.

Відаць, Івану дапамагалі нейкія вышэйшыя сілы. Немцы злавілі яго ў лесе разам з партызанамі. Пры сабе хлопец меў вінтоўку. Таму дзіўна, што яго ўвогуле пакінулі жыць і нават пакармілі. А ўжо ў Германіі немка-гаспадыня вельмі здзіўлялася, што нашы ваеннапаланныя прызвычаіліся есці толькі два разы на дзень, і забяспечыла іх чатырохразовым харчаваннем. Але, дзякуй Богу, мінула ваеннае ліхалецце, мужчыны вярнуліся да родных хат, і нашы героі знайшлі адзін аднаго.

Іван працаваў у лесанарыхтоўчай брыгадзе, і трапіў на кватэру да Ганнінай сям'і. Каханне паміж маладымі людзьмі ўзнікла літаральна з першага погляду. Таму не дзіўна, што хутка адбылося і вяселле.

Ганна разам з прыданым, вялікай дубовай шафай, пераехала ў мужаву вёску. Нялёгка было маладой жанчыне лавіць на сабе кплівыя погляды мясцовых жанок, якія не маглі дараваць прыгажуну Івану вяселля з дзяўчынай не з Крапужына. Не адна маладзіца марыла стаць яго жонкай. А ў ваенны час, калі Іван знаходзіўся ў лагеры пад Мінскам, адна закаханая ў яго дзяўчына назбірала, каб зацікавіць яго сваёй асобай, такую колькасць грошай, што можна было купіць каля дзесяці кароў і падшукаць жыллё не ў вёсцы, а бліжэй да горада. Настолькі заваладаў яе сэрцам дасціпны хлопец. Але ўсё дарэмна, толькі Анюта была вартая прэтэндаваць на месца ягонай абранніцы.

Новую хату маладыя будавалі ўласнымі сіламі, не спадзеючыся ні на чыю дапамогу. Да ўсяго гэтага на іх плечы лёг клопат пра нямоглых бацькоў. Дарэчы, цешча была проста ў захапленні ад працавітага зяця і ласкава клікала яго Іванькам. Як бы складана ні даводзілася, але магутная сіла кахання дапамагла маладым пераадолець усе перашкоды, нават калі, пражыўшы ўсяго паўгода, памерла першае дзіця. У той жа дзень пайшла з жыцця і састарэлая маці Івана. Але маладая сям'я не скарылася лёсу, яны выгадавалі яшчэ чатырох дзяцей. Цяжка было ўсіх накарміць, апрануць, даць адукацыю. Да таго ж адзін за адным паміралі старэйшыя сваякі, а арганізацыя годных пахаванняў і памінак таксама патрабавала немалых выдаткаў са сціплага сямейнага бюджэту. Дык дзе тут думаць пра каханне "на баку"? Кім толькі не працаваў Іван, каб забяспечыць годнае жыццё сваёй сям'і! Акрамя таго, Бладыкі ўтрымлівалі вялікую гаспадарку: у іх былі каровы, козы, куры, свінні, авечкі, гусі. Вядома, зараз здароўе ўжо не тое, таму ад утрымання хатняй жывёлы давялося адмовіцца, ды і ўвогуле, на ўсю вёску засталася адна карова. Ды што казаць, самы малады жыхар сённяшняга Крапужына ўжо размяняў чацвёрты дзесятак.

Іван Ігнацьевіч, які ніколі не быў у шэрагах камуністычнай партыі, абіраўся на пасаду народнага дэпутата Астрашыцкага сельскага Савета. Ён успамінае: *"На ўсіх сходах я перасцярагаў тых, хто зашмат выступаў, што хутка іх час скончыцца. І ўвогуле, дэпутат павінен бараніць народ, а не камуністаў"*. З-за сваёй непрыязнасці да правячай партыі Іван не падтрымліваў стасункаў са сваім стрыечным братам Стасем, які клікаў Івана "сярмяжнаю душою". А як толькі СССР знік з карты свету, Стась выйшаў з камуністычнай партыі. Зараз час ад часу ён заходзіць у госці да брата, каб пагутарыць пра жыццё. Добрае сэрца Івана здольна дараваць самую балючую крыўду...

Лятаючыя дровы

Вядома, у кожнай сям'і, калі людзі не абыякавыя адзін да аднаго, час ад часу ўзнікаюць пэўныя спрэчкі. Але сапраўдны мужчына заўсёды вымушаны ў чымсьці саступіць жанчыне. Да прыкладу, яшчэ на пачатку сямейнага жыцця злыя языкі данеслі Ганне, што муж здрадзіў ёй. І таму, калі ён вярнуўся з чарговага вяселля, на якое быў запрошаны забяспечваць музычнае афармленне, жонка, ні слова не кажучы, пачала шпурляць у яго дровамі, а вясковы хлопец Іван, як сапраўдны джэнтльмен, лавіў дровы, якія ляцелі ў яго, і складваў іх у акуратны стос.

Ад пенсіі да пенсіі

Зараз, калі за плячыма ўжо васьмідзесяцігадовы рубеж, Іван працягвае завіхацца ў хаце і на двары, забяспечваць цяпло і ўтульнасць, клапаціцца пра Ганну, якой ужо цяжка хадзіць. З вялікай цярплівасцю чакае Іван прыбыцця ў вёску аўталаўкі, якая прыязджае сюды толькі два разы на тыдзень, бо калі прапусціш яе прыезд — можна застацца без хлеба і ўсяго самага неабходнага. Цяжка пражыць на невялікую пенсію, асабліва цяпер, калі Івана пазбавілі шэрагу льгот, таму, як кажа ён сам, *"усё падлічваем, бо да наступнай пенсіі можа і не хапіць"*.

Іван Ігнацьевіч ніколі не злоўжываў алкаголем, а пасля нямецкага палону і паліць кінуў. Вядома, яны з Ганнай Юльянаўнай могуць і чарку ўзняць, калі на гэта ёсць пэўныя падставы, але п'яніц асуджаюць, вельмі дрэнна ставяцца да суседзяў, якія, па іх словах, *"пашалелі ад гарэлкі і з-за гэтага трапілі ў "Навінкі"*.

Нялёгкім быў лёс сям'і Бладыкаў, але каханне і падтрымка адно аднаго дапамаглі не зламацца. У 2000 годзе лёс нанёс чарговы ўдар па іх спакойнай старасці — ва ўзросце 44 гадоў памёр сын Уладзімір. Але шматлікія страты кампенсуюць астатнія дзеці, якія старанна дапамагаюць састарэлым бацькам, і ўнукі, якімі проста нельга не ганарыцца: унучка Саша навучаецца ў медыцынскім каледжы пры Медыцынскім універсітэце, марыць стаць стаматолагам; сярод захапленняў унучкі Крысціны гімнастыка, іграна фартэпіяна, харавыя спевы. Унук Ваня абяцае вырасці сапраўдным мужчынам і абаронцам — ён займаецца боксам і займае прызавыя месцы на разнастайных спаборніцтвах.

Не лашчыў бязлітасны лёс сям'ю Бладыкаў, але, нягледзячы на гэта, яны лічаць сябе шчаслівымі. Вось толькі вельмі баяцца страціць адзін аднаго. Доўгія зімовыя вечары на схіле сваіх дзён яны праводзяць ля тэлевізара, час ад часу крытыкуючы вострым народным слоўцам бясконцыя рэкламныя ролікі альбо навамодныя амерыканскія баевікі. Ім няма пра што шкадаваць. Праз усё жыццё пранеслі яны сваё каханне, якое толькі мацнела з гадамі. А маладым, відаць, трэба вучыцца ў такіх людзей цярплівасці і шчырасці і памятаць, што сапраўднае каханне не прадаецца і не купляецца, а дорыцца людзям вышэйшымі сіламі за сумленнае жыццё.

Ірына МУРАЎЁВА.

ДЗІКУНСТВА

Шматдзетная маці-забойца

Супрацоўнікі Маскоўскага РУУС Мінска ўстанавілі асобу жанчыны, якая забіла нованароджанае дзіця. Труп дзяўчынкі ў поліэтыленавым пакеце быў знойдзены на пустыні каля дома №22 па вуліцы Бялецкага.

Як паведамілі ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, забойцай аказалася 27-гадовая мінчанка, жыхарка мікраёна "Паўднёвы захад-6", маці трох дзяцей. Жанчына знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку, у яе дзве дзяўчынкі, пяці і сямі гадоў, і хлопчык, якому ўсяго год. Яна не замужам. У кватэры таксама жыве састарэлая маці, якая хварэе і практычна не ўстае.

Паводле інфармацыі органаў унутраных спраў, жанчына радзіла дома, у ваннай, пупавіну перарэзала лязом, а потым паклала дзіця ў поліэтыленавы пакет і закідала рэчамі. Праз два дні, узяўшы рыдлёўку і пакет, разам са знаёмымі накіравалася на пустку. Зямля была прамёрзлая, рыдлёўцы не паддалася, і тады пакет проста пакінулі пад елкамі, дзе ён і быў знойдзены.

Цяпер па гэтым факце пракуратурай Маскоўскага раёна сталіцы праводзіцца праверка.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

СУЧАСНІК

Маршрут ад ракі маленства

На тых, каго большасць так званых нармальных людзей лічыць дзівакамі, якраз і трымаецца свет. Гэтую шматкроць праверану ісціну пацвярджае сваім жыццём і справамі патомны беларускі земляроб з вёскі Заобаль Шумілінскага раёна, былы штурман ВМФ СССР Анатоль Бычкоў.

Шмат хто з суседзяў здзіўляецца паводзінам Анатоля, ставяцца да яго як да "белай вароны", дзівака. А вось жывёлы, насупраць, туляцца да Бычкова, знаходзяць паблізу ад яго — у гаёчку побач з сядзібай — сховішча ад паляўнічых. Лось Піліп (такую мянушку даў яму Анатоль) прыходзіць сюды акурат у разгар паляўнічага сезона, бо тут бяспечна, ніхто не пакрыўдзіць. Стаіць Піліп і жаласліва глядзіць у вочы гаспадару сядзібы. А што яму, сахатаму, скажаш?

Былы штурман марскога флоту Анатоль Бычкоў — прыклад няўрымслівай працавітасці, уласцівай нашым продкам-вяскоўцам. Ужо год ён займаецца экалагічным турызмам, пра які апошнім часам шмат гаворыцца і пішацца агульнымі фразамі. А Бычкоў паказвае канкрэтны прыклад.

Пад стрэшкай хаты, дзе жыве сям'я Анатоля, чакаюць наступнага лета пяць вёславых катамаранаў з дзіўнымі найменнямі — "Тэвакэ" (імя палінезійскага марахода), "Глю-глю" (паводле аднайменнага марскога апавядання Новікава-Прыбоя), "Князь Вітаўт", "Чорная пярліна" (так звалася калісьці пірацкае судна) і "Гема" (у перакладзе з лацінскай — "каштоўны камень").

Назвы сведчаць аб нязводным рамантызме старога штурмана, які ўсе гэтыя чоўны змайстраваў самастойна і паводле ўласных чарцяжоў. Апошняе — нядзіўна, бо наўрад ці хто яшчэ на Віцебшчыне, а можа, і ва ўсёй Беларусі мае такі досвед у мараходстве, як Анатоль Леанідавіч Бычкоў з вёскі Заобаль, што на Шуміліншчыне. А рукі ў Бычкова залатыя.

Бацька ягоны быў матросам, кнігі пра мора Анатоль чытаў запоем з маленства. Таму зусім натуральна, што калі ён зрабіўся студэнтам сельскагаспадарчай акадэміі, то па начах сніў мора, караблі і сябе на палубе. У выніку Анатоль збег з акадэміі на Паўночны флот.

— Мяне клікаў Сусветны акіян, — узгадвае Бычкоў. — Менавіта мора зрабіла мяне чалавекам, дало адказ на большасць пытанняў, мора падарыла мне веру ў чалавека, у сяброўства, ва ўласныя сілы.

13 год адслужыў Анатоль Бычкоў у Севераморску на ракетных крэйсерах "Киров" і "Маршал Устинов", потым выкладаў у Вышэйшым ваенна-марскім вучылішчы ў Ленінградзе.

Але прасоленую морам душу Бычкова цягнула на радзіму, да берагоў сціплай рэчкі Обаль, дзе нараджаліся, жылі, працавалі і паміралі ўсе ягоныя продкі.

Прыехаўшы ў родны кут, Анатоль, на здзіўленне вяскоўцаў, робіцца фермерам, пачынае апрацоўваць тутэйшую неўрадлівую зямлю на 15 гектарах.

Напачатку мясцовыя жыхары паставіліся з недаверам да пераўтварэння старшага марскога афіцэра ў земляроба: "Ён жа, пэўна, толькі камандаваць умее..." А Бычкоў, атрымаўшы ў першы год зусім не зайздросны ўраджай збожжа, праз 13 год працы дасягнуў ужо 30 цэнтнераў з гектара.

Але сапраўдны поспех сялянскай гаспадаркі з экзатычнай назвай "Нараяна" аказаўся звязаным зусім не з апрацоўкай зямлі, а з навігацыяй. Праз колькі год фермер Бычкоў раптоўна прыпыніў земляробчую практыку і накіраваўся ў Севераморск, каб сустрэцца з флоцкімі таварышамі.

— Я зразумеў, — тлумачыць Анатоль Леанідавіч круты паварот свайго лёсу, — што аддаў зямлі свае даўгі і што трэба рухацца далей. Дый цяжкавата аднаму цягнуць такую гаспадарку, тым больш калі стаіш на парозе восені жыцця — мне 55 год.

У Севераморску, падчас сустрэчы з сябрамі, нарадзілася ў Бычкова ідэя стварэння турыстычнага маршруту па рэчцы Обаль на катамаранах.

Чаму на катамаранах? А таму, што гэтыя двухкорпусныя судны (на тамільскай мове слова "катамаран" азначае "звязаныя адно з адным бярвенні") з'яўляюцца ледзь ці не самымі старажытнымі і бяспечнымі сродкамі перасоўвання па вадзе.

Анатоль сам праектаваў і майстраваў сваю "флатылію". Сам распрацаваў маршрут, сам з маладым кампаньёнам, пляменнікам Алегам, чысціў заваленае дрэвамі рэчышча Обалі, а потым з Алегам і прыёмным сынам Аляксеем зладзіў першую, выпрабавальную вандроўку па Обалі аж да Полацка.

Справа зрушылася з месца, маршрутам пачалі цікавіцца людзі.

— Гэта нядзіўна, — зазначае Анатоль Леанідавіч. — Обаль — рэчка надзіва чыстая, вада ў ёй жывая, нашмат лепшая за ваду Дзвіны.

За лета 2007 года па маршруце, які называецца "Обальскія катамараны" прайшлі на вёслах ужо каля 60 чалавек, у тым ліку — эколагі з грамадскага аб'яднання "Ахова птушак Бацькаўшчыны". Усе былі ў захапленні.

На 20-кіламетровы маршрут па Обалі, нібыта каралі на нітку, нанізаныя гістарычныя і прыродныя славутасці. Водны шлях прылягае праз месца, дзе з 1563-га па 1579 год стаяла фартэцыя Івана Грознага, разбураная войскамі Стэфана Баторыя.

На маршруце — старажытныя курганы ва ўзросце 5—6 тысяч гадоў, былая сядзіба пана Баравіка ў Панячыне з дубамі-волатамі, рэшткі старажытнага млына латыша Рэйна Вальберга непадалёку ад Маськоўшчыны. Завяршаецца маршрут каля сядзібы гаспадара катамаранаў — у вёсцы Забаўкі, што недалёка ад Заобалі. Рака Обаль цячэ літаральна за домам Бычковых. Маляўнічы выгін рэчышча — і перад вандроўнікамі адкрываецца навігацыйны знак у выглядзе піраміды, якую былы штурман Бычкоў склаў з рознакаляровых камянёў — чорных, блакітных, чырвоных і белых, што сімвалізуе першаэлементы свету — зямлю, ваду, паветра, агонь і эфір.

Летась на маршруце з'явіліся некалькі адмыслова абсталяваных для адпачынку прыстаняў, але Анатоль Бычкоў і ягоны партнёр Алег ужо распрацавалі праект развіцця маршруту ў наступным сезоне. Мяркуецца збудаваць на водным шляху базу адпачынку з пяці дамоў, каб турысты мелі магчымасць пераначаваць у прыстойных умовах, прыпыніцца на больш працяглы час.

Цяпер "обальскія катамараншчыкі" шукаюць сродкі на будаўнічыя матэрыялы і дрэвааапрацоўчы станок. Анатоль Бычкоў хоча, каб домікі былі не падобныя адзін на аднаго. А яшчэ ён плануе да лета абсталяваць некалькі катамаранаў ветразямі, каб выйсці пад імі на возера Обаль, куды можна дапляць з аднайменнай рэчкі прытокамі.

Кожны катамаран умяшчае чатырох чалавек, а вытрымлівае — шэсць-сем. Да таго ж яны спраектаваны такім чынам, каб веславалі ўсе, хто плыве.

Пракат катамарана каштуе 60 тысяч рублёў за суткі. Як на чатырох, дык і нядорага.

Частуючы стомленых вандроўнікаў кавай і вегетарыянскім абедам, прыгатаваным гаспадыняй Ларысай Георгіеўнай, Анатоль Бычкоў чуе, што госці павялі размову пра шчасце. Гаспадар уступае ў гутарку.

— Каб займець шчасце, — гаворыць былы штурман і фермер, — чалавек мусіць знайсці мір у сабе самім. А пасля гэтага — зладзіць мір у сваёй сям'і. Мір — гэта спакой.

Дарослыя дзеці Анатоля і Ларысы Бычковых — сын (дарэчы, ён кандыдат сельскагаспадарчых навук) і дачка — жывуць у Санкт-Пецярбургу. Пяць год таму Анатоль Леанідавіч і Ларыса Георгіеўна ўзялі ў сям'ю прыёмнага сына Лёшу, і цяпер ён ужо вучань пятага класа, з ахвотай дапамагае бацьку.

Анатоль Бычкоў лічыць, што ягоны маршрут "Обальскія катамараны" спрыяе таму, каб людзі набывалі мір у душы.

— Уявіце, — кажа ён, — плывуць па ціхай, чыстай рэчцы чатыры чалавекі, дзеляцца думкамі, ведамі пра жыццё. Яны ж у гэты час не адзінокія. Вось так і ўсім нам трэба рухацца з дня ў дзень, разумеючы, што мы — адно цэлае. Хіба ж гэта не суцяшае, не супакойвае душу?

Каму-небудзь Анатоль Бычкоў здаецца дзіваком. Але ён калі і дзівак, то ў тым толькі сэнсе, што здольны ствараць дзівосы. Бо ён дзейны і настойлівы чалавек.

— Трэба дзейнічаць, бо гэта — адзіны сродак ад старасці, — упэўнены стары мараход, дасведчаны фермер і паспяховы прадпрымальнік Анатоль Бычкоў з вёскі Заобаль.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

СКАНДАЛ

Абкрадалі... школы і дзіцячыя садкі

Справа на падставе ч.3 арт.210 Крымінальнага кодэкса (крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі) распачата паводле матэрыялаў УБЭЗ ГУУС Мінгарвыканкама ў дачыненні да двух намеснікаў галоўнага бухгалтара, кіраўніка фінансавай групы і бухгалтара ўпраўлення адукацыі адной з раённых адміністрацый Мінска.

Як паведаміла БелаПАН оперупаўнаважаны па асабліва важных справах УБЭЗ МУС Беларусі Вераніка Пасмецьева, гэтыя людзі, злоўжываючы службовымі паўнамоцтвамі, шляхам незаконнага спісання грашовых сродкаў з фондаў заработнай платы розных дашкольных і школьных устаноў раёна залічылі на свае асабістыя карт-рахункі амаль 20 мільёнаў рублёў. Грошы былі выкрадзены з сумы, што склалася ў сістэме адукацыі раёна за кошт эканоміі грашовых сродкаў школ і дашкольных устаноў.

Падазроныя, якія цяпер знаходзяцца пад падпіскай аб нявыездзе, рыхтавалі фальшывыя бухгалтарскія дакументы і падавалі іх у банк для атрымання зарплаты.

Згодна з крымінальным заканадаўствам, за крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі ў буйным памеры службовым асобам пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі ад 3 да 10 гадоў з канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

КРЫМІНАЛ

«Лялечнікі» папаліся

Злачынную групу махляроў, якія рабавалі пенсіянераў, затрымалі ў Мінску.

На працягу 2007 года і сёлета яны з дапамогай так званай "лялькі" (муляжа грошай) выманьвалі ў старых людзей грошы, паведамляе БЕЛТА.

Злачынцы высочвалі сваіх ахвяр на поштах альбо ў аддзяленнях банкаў, дзе пераконваліся, што яны атрымалі пенсію ці абмянялі валюту. На вуліцы адзін з махляроў падкідваў "ляльку", якую знаходзіў пенсіянер альбо іншы злачынца, які прапаноўваў бабулі ці дзядулі падзяліць знаходку.

У гэты момант і з'яўляўся іх гаспадар, які патрабаваў у "шчасліўчыкаў" паказаць усе купюры, якія маюць пры сабе, каб знайсці свае. Падчас перагляду грошай махляры выцягвалі частку купюраў з грошай пенсіянера і знікалі. Колькі старых людзей у сталіцы пацярпела ад іх дзейнасці, не паведамляецца.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 СТУДЗЕНЯ 2008 г.

ВОКРУГ СПОРТА

Умер Бобби Фишер

В Исландии на этой неделе прошли похороны бывшего чемпиона мира по шахматам Бобби Фишера.

На церемонии прощания с Фишером, закрытой для представителей СМИ, присутствовали несколько близких друзей шахматиста и его многолетняя спутница жизни — Миоко Ватаи.

Гениальный шахматист был похоронен на кладбище католического прихода в небольшом городке Селфосс, расположенном в 60 километрах от Рейкьявика.

Фишер скончался 19 января на 65-м году жизни в одной из больниц Рейкьявика после двухмесячной болезни. В Исландию шахматист переехал на постоянное место жительства в 2005 году. Эта страна предоставила ему гражданство после того, как его американский паспорт был аннулирован, а власти США начали судебное преследование шахматиста за участие в матче, состоявшемся в Белграде в 1992 году, обвинив его в нарушении международных санкций против бывшей Югославии.

В 2004 году Фишер, несколько лет проживший в Японии, был задержан с аннулированным американским паспортом в токийском аэропорту и помещен в тюрьму. США добивались выдачи шахматиста с целью привлечь его к суду, однако власти Исландии, где на матче, состоявшемся в 1972 году, он обыграл Бориса Спасского и стал чемпионом мира, предоставили ему гражданство.

Даешь проведение матчей чемпионата Беларуси в Париже!

Футбольный клуб "Москва" предложил питерскому "Зениту" сыграть матч второго круга в Лондоне.

Руководство питерской команды дало предварительное согласие. В ближайшее время клубы намерены заручиться поддержкой Российского футбольного союза.

Само предложение провести матч ФК "Москва" — "Зенит" поступило от компании IMG, которая занимается, в частности, агентской деятельностью и представляет интересы ряда футболистов, выступающих в российской премьер-лиге.

Президент ФК "Москва" считает, что проведение матча чемпионата России в Лондоне поспособствует развитию российской премьер-лиги вообще, и клубов, которые примут в нем участие, в частности.

Ранее матчи чемпионата России никогда не проводились за границей. В 2007 году "Зенит" стал победителем национального первенства, а ФК "Москва" занял четвертое место. Календарь чемпионата России 2008 года еще не утвержден, поэтому точная дата матча ФК "Москва" — "Зенит" пока не известна.

Бекхэм снова торгуется

Бывший капитан футбольной сборной Англии Дэвид Бекхэм, выступающий сейчас в чемпионате США, может перейти в английский "Ньюкасл".

Владелец английского клуба миллиардер Майк Эшли начал неофициальные переговоры на предмет перехода Бекхэма, пишет издание The Mirror.

Бизнесмен готов заплатить американскому клубу компенсацию за игрока. Эшли, который является совладельцем компании Adidas, пытается договориться с "Лос-Анджелесом" о том, чтобы Бекхэм перешел в "Ньюкасл" на правах аренды, но при этом он готов заплатить американскому клубу достойную компенсацию и заключить с футболистом многолетний контракт.

Стоит отметить, что Бекхэм является лицом Adidas, и переход в "Ньюкасл" может быть выгоден для всех сторон с коммерческой точки зрения.

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

Екатерина КАРСТЕН:

«Дочь Сашка тоже уже садится в лодку»

Лучшая спортсменка Беларуси прошлого года, олимпийская чемпионка и неоднократная чемпионка мира по академической гребле Екатерина КАРСТЕН — редкий гость в Минске. Но всегда желанный.

В последнее время Катя живет и тренируется в Германии. У нее есть любимый и любящий муж Вильфред, дочь Сашка и тяжелое, но отнюдь не тягостное занятие академической греблей, которое уже превратилось в работу. Екатерина Великая, как ее часто называют журналисты, настолько великая, что, оказалось, перед ней открываются даже границы.

— Приехали с мужем Вильфредом и тренером на машине на пограничный переход в Брест, а там оказалось, что Вильфред то ли забыл, то ли потерял вкладыш в паспорт с визой, — теперь уже с улыбкой рассказывает Екатерина. — Что делать? Начала объяснять пограничникам, что, мол, еду по приглашению Национального олимпийского комитета, что случился такой вот конфуз... Те давай звонить своему начальнику. А я в Минск своим позвонила. Через пару минут служивые приходят, говорят: "Все в порядке, Екатерина, вопрос решен, проезжайте. Я еще мужу сказала: "О-о! Оказывается, в Беларусь уже и без виз пускают".

— Всей семьей приехали или только с мужем?

— Только с Вильфредом. Дочь осталась в Германии, она у меня уже взрослая. В этом году у нее распределение в другие школы, так что появились и небольшие проблемы, для решения которых нужно время. Сашка, кстати, заявила мне на днях: "Мама, я тоже буду гребчихой. Можно уже заниматься?" "Дело твое, — отвечаю, — но годика три еще нужно подождать". Ей же 9 мая только десять лет будет.

— Я помню, что вы ее раньше постоянно брали с собой на сборы...

— Она все время ездила маленькой со мной на сборы, привыкла к гребле. В лодку, конечно, не залезала, но в четыре годика уже сидела на тренажере. Позже стала заниматься гандболом, волейболом, а пару дней назад, повторюсь, сделала мне официальное заявление насчет академической гребли. Уже даже и на берегу пробовала себя в лодке.

— Так вы не против, чтобы Сашка превзошла маму?

— В принципе, я не собираюсь ей указывать какое-то место в жизни. Сама должна решить, что ближе. Академическая гребля, конечно, тяжелый вид спорта, а она у меня такая худенькая, хотя и высокая. Но это пускай будет ее выбор. Ей решать. А превзойдет меня, так я буду только рада. Но пока Александра раз в неделю занимается гандболом, хотя я даже и не видела, как она там тренируется.

— Дочь больше общается на немецком языке или на русском?

— На немецком.

— Как часто она приезжает в Беларусь?

— Очень редко. Была на осенних каникулах здесь.

— Катя, если переходить к делам более земным, а точнее — водным, как вы оцениваете свой результат в этом сезоне? Приятно, что снова признаны лучшей спортсменкой года?

— Последнее очень удивило! Мне кто-то раньше говорил, что спортсмен не может два года подряд признаваться лучшим. И вот — нате вам сюрприз! Но я ведь тоже в прошлом году своих болельщиков не подвела и, считаю, что выступила просто отлично.

— А кто пригласил вас в Минск на чествование?

— Из Национального олимпийского комитета позвонили буквально за день до мероприятия. В 12 часов дня по немецкому времени у меня раздался звонок, а уже в шесть вечера мы выехали на машине в Минск. До этого еще и потренироваться успела, и Александру "пристроила"...

— И куда "пристроили"?

— Со мной еще две девочки тренируются, они за ней, когда меня нет, и наблюдают.

— Зимой в Германии тренируетесь?

— Да, там вода стоит, не замерзает. Перед Олимпиадой приеду потренироваться сюда, поучаствую в Бресте в Кубке Беларуси.

— Предолимпийское волнение чувствуется?

— Волнуюсь не столько за свое выступление, сколько за то, что может "оборваться" планируемый результат. Понимаете, уже все привыкли, что Екатерина Карстен выигрывает только "золото". Вот этот груз очень давит. Очень тяжело жить и думать, что ты не имеешь права оступиться и не имеешь права на ошибку. Хотя по самим тренировкам и по степени готовности чувствую себя очень уверенно.

— Ваша уверенность окрепла, когда заявили, что выиграете в Пекине "золото"?

— Я буду стараться — вот все, что могу сказать. Но вы должны понимать, что спорт, а уж тем более Олимпийские игры — очень непредсказуемы. Последние три года меня пока никто не побеждал, так что есть, как говорят, все предпосылки.

— В белорусском спорте после завершения карьеры себя видите?

— А я разве говорила о завершении своей спортивной карьеры? Посмотрим, какой будет результат в Пекине. Может быть, буду тренироваться еще до 2012 года и не исключаю свое выступление на Олимпиаде в Лондоне.

— Спортивные чиновники говорят, что у спортсменов при подготовке к Олимпиаде абсолютно нет никаких проблем. У вас их действительно нет?

— Как бы вам сказать... Вот намедни тренер мой поехал на немецкий завод по производству спортивных лодок, и оказалось, что на мою лодку нет запроса из Белорусской федерации академической гребли. В принципе, я тренируюсь на старой лодке, а новая предназначена для Олимпиады в Пекине. Но я даже не знаю, почему наша Федерация забыла о запросе на лодку.

— Сколько делается такая лодка?

— В таком вопросе торопиться не стоит. На заводе могут сделать побыстрее, но это не значит, что качественнее. Тем более что сейчас, накануне Олимпиады, на завод поступает очень много запросов. Так что нашим чиновникам следовало бы не "хлопать ушами".

— Катя, родной дом часто навещаете?

— Очень редко. Бывают моменты, когда есть свободное время, но перед Олимпиадой, боюсь, будет очень проблематично вырваться домой. Хотя к маме я приезжаю с огромным удовольствием.

Алесь СИВЫЙ.
Фото Юрия ДЕДИНКИНА.

МАЗАІКА

Ракіроўка

Былога галоўнага трэнера футбольнага мінскага "Дынама" Аляксандра Хацкевіча рэкамендавалі на пасаду галоўнага трэнера юніёрскай зборнай Беларусі.

Былы настаўнік юніёраў Пётр Міхееў больш са зборнай не працуе. На пасяджэнні камітэта, які ўзначальвае намеснік старшыні Асацыяцыі "Беларуская федэрацыя футбола" Міхаіл Вяргеенка, выступленне зборнай у адборачным турніры чэмпіянату Еўропы ў верасні 2007 года і міжнародным юнацкім турніры ў Мінску ў студзені гэтага года было прызнана незадавальняючым, пасля чаго Міхеева вызвалілі ад займаемай пасады.

Ці дапамаглі трэнеры-немцы беларускай зборнай?

Пагадненне з клубам другой бундэслігі з нямецкай Ены "Карл Цэйс" падпісаў галкіпер футбольнай зборнай Беларусі Васіль Хамутоўскі. Пагадненне будзе дзейнічаць да 30 чэрвеня 2008 года. Галкіпер беларускай зборнай паспеў ужо ўзяць удзел у спарынгу з кіеўскім "Арсеналам", у якім "Карл Цэйс" прайграў з лікам 1:2. Хамутоўскі быў заменены на 60-й хвіліне, прапусціўшы адзін гол.

Барацьба за Ковеля працягваецца

Кіраўніцтва львоўскага футбольнага клуба "Карпаты" засталося вельмі незадаволеным апошнім лістом ад мінскага "Дынама".

Нагадаем, што клубы па-ранейшаму не могуць падзяліць футбаліста Леаніда Ковеля, якога "Дынама" ў мінулым годзе на год аддало ў арэнду ўкраінскаму клубу. Зараз генеральны дырэктар "Карпат" Аляксандр Яфрэмаў заявіў: "Больш уступаць у дыялог з "Дынама" мы не будзем, і ўжо рыхтуем неабходны пакет дакументаў у дысцыплінарныя органы ФІФА. Няхай нас рассудзяць вышэйшыя футбольныя інстанцыі. Вельмі непрыемна, што гісторыя, якая пачыналася напрыканцы лютага мінулага года сяброўскімі адносінамі двух прэзідэнтаў клуба, так дрэнна заканчваецца".

"Брэсцкія зубры" ідуць!

Каманда кадэтаў "Брэсцкія зубры" стала пераможцай VIII Міжнароднага турніру па бейсболе на Кубак прэзідэнта Польшчы.

У фінале нашы бейсбалісты з лікам 2:1 перамаглі каманду з Вільнюса. Усяго ж брэстаўчане правялі на гэтых спаборніцтвах шэсць сустрэч. Прайгралі толькі ў адной — камандзе з Каўнаса. Лепшым іграком турніру прызнаны ігрок "Брэсцкіх зуброў" Аляксей Лукашэвіч. Усяго на гэтых прэстыжных спаборніцтвах бралі ўдзел 12 каманд (ігракі 1994-1996 гадоў нараджэння) з Польшчы, Літвы, Расіі, Малдовы і Беларусі.

У лютым брэсцкая каманда возьме ўдзел у рэспубліканскім турніры па бейсболе ў Мінску.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ШАХМАТЫ

Из шахматной классики

Один из видных мастеров советской шахматной композиции Сергей Михайлович Каминер (1908--1938) свой первый этюд опубликовал в 1924 году. Всего же за короткий жизненный путь он составил 65 этюдов, из которых 27 были отмечены призами и отличиями на конкурсах. В 1938 году он был репрессирован и погиб в ГУЛАГе. Один из этюдов Каминера мы предлагаем вниманию любителей шахматной композиции.

Белые: Kph5, Ca2, Kg5, Kh8, п. e6 (5).

Черные: Kpd4, Ke3, Kf8, п. d2 (4).

Выигрыш.

Положение на доске выглядит обоюдоострым, проходные пешки противников грозят пройти в ферзи. Но ход за белыми, и они используют это обстоятельство с максимальной силой. 1.Kf3+ Kpc3 2.e7 Kd7 3.K:d2 Kf5! Не допуская превращения белой пешки ни в ферзя, ни в коня (4.e8K? Kp:d2 5.Ce6 Kf6+ 6.K:f6 Kg7+) 4.Ke4+ Kpd4 5.e8K! Теперь превращение пешки в коня ведет к победе. 5...Kp:e4 6.Cb1+ Kpe5 7.Kg6+ Kpe6 8.Ca2x! Эффектный мат в центре доски. Этюд был удостоен первого приза на конкурсе журнала "Шахматы" в 1927 году.

Сверьте решение

Двухходовка А.Азова (опубликована 23.11): 1.Ла5!

Композиция Л.Кнотека ("Народная воля" за 30.11.): **1.Фg7**!

Цугцванг. 1...Kpa7 2.c8C! Kp:a8 3.Фa1x, 1...Kpc8 2.Фg2! Ke5 3.Kb6x, 1...Kp:a8 2.c8Ф+ Kpa7 3.C:c5x.



Смотр юных талантов

В Турции прошел чемпионат мира по шахматам среди юношей и девушек в возрастных группах до 8, 10, 12, 14, 16 и 18 лет. В соревнованиях выступили около полутора тысяч юных спортсменов со всех континентов. В чемпионате участвовала большая группа юных белорусских шахматистов.

В младшей возрастной группе (до 8 лет) хорошее впечатление оставила игра Антона Шеремета из Осиповичей. На протяжении всей турнирной дистанции он боролся за высокие места. И лишь обидное поражение в последнем туре в партии, в которой Антон добился преимущества, снизило результат. В итоге Шеремет занял 11-е место при 123 участниках. В 11 встречах он набрал 7,5 очка. Для дебюта отличный итог.

У девочек в этой группе выступала Анастасия Селенчик из Гомельской области. Она набрала 5 очков из 11 и заняла 42-е место при 72 участницах. У девочек в возрасте до 10 лет нашу республику представляла Катя Протько из Жодино. Она заняла 40-е место при 104 участницах. В 11 партиях Катя набрала 6 очков.

У мальчиков в возрасте до 10 лет наш Валентин Ежель (Гомель) финишировал с результатом 5 очков из 11, что принесло ему только 99-е место при 156 участниках.

Лучший результат из белорусских участников показала минчанка, кандидат в мастера Анастасия Зезюлькина, которая выступала в чемпионате девушек в возрасте до 12 лет. Она набрала 7,5 очка из 11, что позволило ей финишировать на 10-м месте при 120 участницах. У юношей в этой группе минчанин Андрей Савицкий, набрав 5,5 очка из 11, занял 74-е место при 161 участнике.

В чемпионате девушек до 14 лет минчанка Татьяна Рево заняла 45-е место при 112 участницах. В 11 встречах она набрала 6 очков. Более высокий результат показал кандидат в мастера Давид Хачикян из Барановичей.

Он набрал 7 очков из 11, что принесло ему 23-е место при 154 участниках.

В соревнованиях девушек до 16 лет минчанка Алиса Щербакова с 5 очками финишировала на 66-м месте при 104 соперницах. Слабее в этой группе у юношей сыграл Дмитрий Полещук (Минск). Его результат -- 4,5 очка, 93-е место при 126 соперниках.

В старшей возрастной группе (до 18 лет) у девушек играла витебчанка, кандидат в мастера Елена Минина. Она довольствовалась 50-процентным результатом - 5,5 из 11, 35-е место при 80 участницах. У юношей наш Юрий Борсук (Минск) набрал 6 очков и финишировал на 41-м месте при 144 участниках.

В целом выступление белорусских шахматистов вряд ли можно признать успешным. Особенно если вспомнить, что были такие достижения, как завоевание Юрием Тихоновым в 1992 году и Сергеем Жигалко в 2003 году золотых наград на подобном чемпионате мира.

СИТУАЦИЯ

Брестская спортсменка выступает за Германию

А дома фирма, закрепленная за единственной олимпийской кандидаткой от области, отказалась помогать ей из-за "нехватки средств".

В номинации "бадминтон" единственный реальный кандидат на поездку в Китай — брестчанка Ольга Конон. 18-летняя спортсменка — мастер спорта международного класса по этому виду спорта. Ее высшее достижение — чемпионка Европы-2007 среди юниоров в парном разряде.

На сегодняшний день в олимпийском рейтинге Оля — 36-я. Чтобы принять-таки участие в Олимпийских играх, к началу лета ей необходимо оказаться не ниже 38-й позиции.

Учитывая прежние победы юной спортсменки, можно верить в удачу. Что удивительно, золото и бронзу в 2007-м Оля завоевала после серьезной травмы — разрыва крестообразных связок. Вернуться на корт, по словам брестчанки, помогли Бог, родители и немецкие врачи.

К слову, землячка — участница международного бадминтонного лагеря в немецком Саарбрюкене. И уже второй год выступает за один из клубов Германии.

Заинтересованные фонды не скупятся на средства для подготовки европейских талантов. Поэтому два десятка молодых людей из немецкого "кемпа" уже второй год готовят к поездке в Пекин специалисты из Швеции, Китая и Кореи.

— Там я чувствую себя звездой, — комментирует Конон. — После прошлогодних побед обложки немецких журналов пестрили моими фотографиями. Жаль, в Беларуси это мало кого интересовало.

Уже в 12 лет, как только начались поездки за рубеж, Оля поняла: ждать помощи не от кого. Даже Белорусская федерация бадминтона не могла систематически выделять деньги для "загранкомандировок".

Вот и сейчас официальный тренер, закрепленный за спортсменкой в Беларуси, — Виктор Конах мало чем бывает полезен. А процветающее брестское предприятие отказалось от спонсорства.

Но Оля не отчаивается, рассчитывает на свои силы. И примером ей служит бадминтонный кумир — Надежда Костючик. Сменив гражданство, эта спортсменка сейчас приносит славу нашей западной соседке — Польше.

Федор АГАФЬЕВ,
www.bulletinonline.org

РЭКОРД

Штурханула... на лепшы вынік у свеце

На турніры Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па лёгкай атлетыцы ў Мінску беларуская штурхальніца ядра Надзея Астапчук атрымала перамогу з вынікам 19 метраў 73 сантыметры, паказаўшы найлепшы вынік сезона ў свеце.

Пра гэта паведаміла прэс-сакратар Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Анастасія Марыніна.

Другую пазіцыю займае амерыканка Элізабет Уонлес, у актыве якой штуршок на 18 м 18 см (11 студзеня на спаборніцтвах у ЗША).

Нагадаем, што на сусветным лёгкаатлетычным фінале ў Штутгарце (Германія) спартсменка заваявала залаты медаль (20,45 м), на чэмпіянаце свету ў Японіі — сярэбраны (20,48 м).

Дарэчы, сусветны рэкорд у гэтай дысцыпліне ў жанчын складае 22,50 м (устаноўлены ў 1977 годзе Хеленай Фібінгеравай з Чэхаславакіі), у мужчын — 22,66 м (у 1989 годзе амерыканцам Рэндзі Барнсам).

Дзмітрый УЛАСАЎ.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 22.01.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №